# ПРЭЗІДЭНТ ДАРУЧАЕ І КАНТРАЛЮЕ

7 кастрычніка 1998 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка прыняў са справаздачай прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С. С. Лінга.

Як паведаміла прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы, прэзідэнту было далажана аб ходзе падрыхтоўкі візіту прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь у Маскву і маючых адбыцца перагавораў са Старшынёй урада Расійскай Федэрацыі Я. М. Прымаковым, на якіх плануецца абмеркаваць шэраг аспектаў эканамічнага супрацоўніцтва, у тым ліку ўзаемныя пастаўкі прадукцыі.

Прэзідэнт быў інфармаваны таксама аб падрыхтоўцы пасяджэння Выканкама Саюза дзвюх дзяржаў, намечанага на 16 кастрычніка 1998 года, і перагавораў з урадам Масквы і мэрам расійскай сталіцы Ю. М. Лужковым.

Прэм'ер-міністр расказаў кіраўніку дзяржавы аб выніках візіту ва Украіну і праведзеных перагаворах з прэзідэнтам Украіны Л. Д. Кучмам, прэм'ер-міністрам В. П. Пуставойценкам. У ходзе гэтых сустрэч у цэнтры ўвагі знаходзіліся пытанні зняцця абмежаванняў у гандлі Беларусі і Украіны, развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі з Крымам, з Кіеўскай вобласцю і суседнімі абласцямі Украіны. Дасягнута дамоўленасць аб падрыхтоўцы да падпісання кіраўнікамі дзяржаў да канца гэтага года адпаведных дакументаў аб парадку ўрэгулявання пазыковых абавязацельстваў. Размова ідзе аб доўгу Украіны нашай краіне, які складае каля 217 млн. долараў. Бакі дамовіліся правесці ў кастрычніку 1998 года ў г. Мінску пасяджэнне сумеснай беларуска-украінскай камісіі па эканамічнаму супрацоўніцтву.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка адобрыў ідэю правядзення штоквартальных сустрэч прэм'ер-міністраў абедзвюх краін. С. С. Лінгу дадзены даручэнні, якія датычаць канкрэтных напрамкаў двухбаковага супрацоўніцтва.

Кіраўнік урада ў сваім дакладзе прэзідэнту закрануў некаторыя аспекты сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне і работы галін народнай гаспадаркі.

Прэзідэнт выказаў занепакоенасць сітуацыяй, што склалася ў сферы цэнаўтварэння і запазычанасці па зарплаце. Ён даручыў ураду (Лінг С. С.) сумесна з Федэрацыяй прафсаюзаў (Ганчарык У. І) выпрацаваць у рамках Нацыянальнага Савета адпаведныя меры і далажыць аб іх кіраўніку дзяржавы да 1 лістапада 1998 года.

Аналагічныя кансультацыі з мэтай прыняцця канкрэтных мераў павінны адбыцца на ўзроўні міністэрстваў і галіновых прафсаюзаў, а таксама на рэгіянальным узроўні.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы